УДК 811.161.3"255.2 = 112.2

Г.М. СТАРАСЦІНА

ПЕРАКЛАД СТЫЛІСТЫЧНА МАРКІРАВАНАЙ ЛЕКСІКІ З РАМАНАЎ І. МЕЛЕЖА "ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ", "ЗАВЕІ, СНЕЖАНЬ" НА НЯМЕЦКУЮ МОВУ

У артыкуле аналізуецца пераклад беларускіх стылістычна маркіраваных лексічных адзінак на нямецкую мову. У аснову даследавання пакладзены фактычны матэрыял, які быў вылучаны з раманаў І. Мележа "Людзі на балоце", "Завеі, снежань" і іх перакладаў на нямецкую мову. У артыкуле разглядаюцца размоўныя лексічныя адзінкі арыгінала, вылучаюцца іх адпаведнікі ў нямецкамоўным перакладзе. Даследуюцца розныя тыпы дыялектызмаў, аналізуецца іх пераклад на нямецкую мову. Не застаюцца па-за ўвагай і розныя віды эквівалентаў беларускіх стылістычна маркіраваных лексем. У выніку супастаўляльнага аналізу раманаў І. Мележа "Людзі на балоце", "Завеі, снежань" і іх перакладаў на нямецкую мову вылучаюцца асноўныя прыёмы дасягнення лексіка-стылістычнай эквівалентнасці, якія дапамагаюць пераадолець лінгвастылістычную рознасістэмнасць беларускай і нямецкай моў.

Стылістычна маркіраваныя лексемы фарміруюць і характарызуюць ідыястыль пісьменніка. У творах І. Мележа значнае месца займае размоўная лексіка, частку якой складаюць дыялектызмы. Разам з гутарковымі словамі, блізкімі да нейтральных, пісьменнік часта ўжывае прастамоўную лексіку, вульгарызмы, ён не імкнецца "спецыяльна ўпрыгожыць мову сваіх герояў, не ўкладвае ў іх вусны і

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тое, што яны не могуць гаварыць" [1, с. 102]. Як адзначае М.В. Абабурка, "выкарыстоўваючы моўна-выяўленчыя сродкі сучаснай беларускай мовы і імкнучыся даць гаварыць героям так, як яны гавораць у жыцці, І. Мележ па-майстэрску сінтэзаваў вусна-гутарковую мову з пісьмова-кніжнай для паказу тыповых характараў у тыповых абставінах" [2, с. 76].

Асаблівасці лексікі раманаў І. Мележа ўжо былі прадметам даследавання некаторых беларускіх лінгвістаў (З.У. Драздовай [1], М.В. Абабуркі [2], Р.М. Казловай [3] і інш.), аднак яе пераклад на нямецкую мову яшчэ не разглядаўся.

Мэта артыкула – даследаваць пераклад стылістычна маркіраваных лексічных адзінак з раманаў І. Мележа "Людзі на балоце", "Завеі, снежань" на нямецкую мову.

Аналіз размоўнай лексікі арыгінала і яе адпаведнікаў у тэкстах перакладу дае падставы вылучыць наступныя тыпы суаднесенасці лексічных адзінак.

1. Беларускае размоўнае слова – нямецкае размоўнае слова: – *Трэба часам* ***прыцерціся****, як кажуць* [4, с. 57]. // "*Manchmal muß man* ***sich zusammenraufen****, wie man so sagt*" [5, с. 51]. Параўн.: бел. *прыцерціся* (*разм.* 'прыстасавацца, прыладзіцца') – ням. *sich zusammenraufen* (*разм.* 'прыцерціся'). У прыведзеным прыкладзе беларускамоўная і нямецкамоўная лексемы адносяцца да аднаго і таго ж функцыянальнага стылю і не маюць дадатковых экспрэсіўных адценняў значэння. Аднак значная колькасць лексічных адзінак гэтай групы ўтрымліваюць у сабе адпаведную эмацыянальную ацэнку пэўнай з'явы, у большасці выпадкаў яны маюць зніжаную стылістычную афарбоўку. Размоўныя словы з адценнем грубаватасці, зняваг, пагарды кваліфікуюцца як прастамоўныя і ўжываюцца ў творах І. Мележа з мэтай зніжанай ацэнкі прадмета гаворкі, перадаюць зневажальнае стаўленне да персанажаў. Такім чынам, у межах дадзенай групы ў залежнасці ад эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі можна вылучыць падгрупы:

1) зневажальнае – грубае: – *Я быў тады* ***смаркачом*** [4, с. 56]. // "*Ich war damals noch* ***eine Rotznase***" [5, с. 50]. Параўн.: бел. *смаркач* (*разм. зневаж.*'пра дзіця, а таксама пра маладога нявопытнага ў справах чалавека') – ням. *die Rotznase* (*груб.* 'саплівец, смаркач');

2) лаянкавае – лаянкавае: *Спіць,* ***падла****, ніяк не прачнецца*! – *злаваў Васіль* [6, с. 331]. // ***Das Luder*** *schläft immer noch, dachte Wassil verärgert* [7, с. 435]. Параўн.: бел. *падла* (*праст. лаянк.* 'лаянка, грубы зварот') – ням. *das Luder* (*лаянк.*'сцерва, падлюга');

3) зневажальнае – размоўнае: *Чаго тады было не коцнуць* ***смаркача***! [6, с. 348]. // *Die Männer hätten* ***den Grünschnabel*** *damals umlegen sollen* [7, с. 458]. Параўн.: бел. *смаркач* (*разм. зневаж.*'пра дзіця, а таксама пра маладога нявопытнага ў справах чалавека') – ням. *der Grünschnabel* (*разм.* 'малакасос, блазнюк');

4) пагардлівае – фамільярнае: – *Цераз нейкую* ***галадранку*** *свету не бачыць*! [4, с. 24]. // "*Wegen irgend so* ***einer Schlampe*** *siehst du die Welt nicht mehr*!" [5, с. 24]. Параўн.: бел. *галадранка* (*разм. пагард.* 'бяднячка') — ням. *die Schlampe* (*фам.* 'неахайная жанчына');

5) грубае – грубае: – *Толькі загаворыш,* ***морду*** *адварочвае*! [4, с. 15]. // "*Brauchst bloß den Mund aufzumachen, da wendet er* ***die Schnauze*** *ab*" [5, с. 17]. Параўн.: бел. *морда* (*праст. груб.* 'твар чалавека') – ням. *die Schnauze* (*груб.* 'морда');

6) грубае – размоўнае: – *Гайсаеш, пакуль не прынясе ў пялёнках* ***байструка***! [6, с. 238]. // "*Du wirst ihnen so lange nachsteigen, bis dir eine* ***einen Balg*** *anschleppt*" [7, с. 311]. Параўн.: бел. *байструк* (*разм. груб.* 'пазашлюбнае дзіця') – ням. *der Balg* (*разм.* 'гарэза, свавольнік');

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Беларускае размоўнае слова – нямецкі фразеалагізм, які адносіцца да размоўнага стылю: – *А мы – сядзім, як цельпукі! Зрабіць нічога не ўмеем.* ***Міндальнічаем***! [6, с. 112]. // "*Und wir sitzen da wie Schafe, können ihnen nicht ans Zeug,* ***fassen*** *sie* ***mit Samthandschuhen an***!" [7, с. 144]. Параўн.: бел. *міндальнічаць* (*разм.* 'праяўляць непатрэбную мяккасць, паблажлівасць да каго-н.') – ням. *mit Samthandschuhen anfassen* (*разм.* 'міндальнічаць').

3. Беларускае размоўнае слова – нямецкае стылістычна нейтральнае слова: *Прыпрэшся першы – кінецца ўсім, што баішся, пасмялеюць; апошні* ***прыпаўзеш*** *– каб позна не было* [6, с. 309]. // *Kommst du als erster, denken sie, du hast Angst, und werden übermütig, und* ***kommst*** *du zuletzt, kann es zu spät sein* [7, с. 408]. Параўн.: бел. *паўзці* (*разм.* 'ісці, перамяшчацца вельмі павольна') – ням. *kommen* ('прыходзіць').

4. Беларускае размоўнае слова – нямецкае няўстойлівае стылістычна нейтральнае словаспалучэнне: *Аказалася, і яму паспытаць давялося: не ў харомах рос, у цёмным бараку,* ***бязбацькавічам*** [4, с. 225]. // *War nicht in Samt und Seide aufgewachsen, sondern in einer dunklen Baracke,* ***ohne Vater*** [5, с. 89]. Параўн.: бел. *бязбацькавіч* (*разм.* 'той, хто жыве, выхоўваецца без бацькі, сірата') – ням. *ohne Vater* ('без бацькі').

5. Беларускае размоўнае слова – нямецкі стылістычна нейтральны фразеалагізм: – *Самы час. Бярыся, не* ***валаводзься*** *попусту* [6, с. 192]. // "*Der richtige Zeitpunkt.* ***Schieb's*** *nicht* ***auf die lange Bank***" [7, с. 250]. Параўн.: бел. *валаводзіцца* (*разм.* 'аддаваць залішне многа ўвагі і часу каму-, чаму-н.') – ням. *auf die lange Bank schieben* ('адкладваць на доўгі час').

6. Беларускае размоўнае слова – пропуск лексічнай адзінкі ў нямецкамоўным перакладзе: "*З ГПУ, можа,* ***прысунуўся****, вынюхаць, што і як*" [6, с. 311]. // *Vielleicht einer von der GPU, der hier ein bißchen rumschnüffeln will*? [7, с. 410].

Прааналізаваныя тыпы суаднесенасці лексічных адзінак арыгінала і перакладу маюць розную колькасную рэпрэзентацыю. Так, 42,2% беларускамоўных размоўных лексем перадаюцца на нямецкую мову словам ці фразеалагізмам таго ж самага функцыянальнага стылю. Нейтральныя адзінкі ўтвараюць самую шматлікую групу лексіка-стылістычных эквівалентаў беларускіх размоўных лексем і складаюць 54,8% ад агульнай колькасці. 3% гутарковых слоў на нямецкую мову наогул не перакладаюцца.

Частку размоўнай лексікі складаюць дыялектызмы – словы і выразы з мясцовых гаворак. У раманах "Людзі на балоце", "Завеі, снежань" І. Мележ шырока выкарыстоўвае дыялектныя словы. Яны надаюць маўленню персанажаў адметнасць, робяць яго больш яркім, індывідуалізаваным. На думку М.Ц. Кавалёвай, пісьменнік знайшоў сваю манеру ўжывання дыялектнай лексікі ў мастацкім творы: ён бярэ толькі тое, што можа быць зразумелым у кантэксце [8, с. 341].

У раманах сустракаюцца розныя тыпы дыялектызмаў.

1. Фанетычныя дыялектызмы (ужываюцца ў раманах часцей за ўсё і складаюць 62,8% ад агульнай колькасці) уласцівыя толькі маўленню персанажаў. Пісьменнік выкарыстоўвае названы тып дыялектызмаў з мэтай перадаць мясцовы каларыт і такім чынам ускосна акрэсліць месца дзеяння, даць маўленчую характарыстыку героям твора, перадаць асаблівасці палескай гаворкі: – *Тато, не чапайце* ***ето****, – папрасіў ён лагодна* [4, с. 24]. // "*Vater, lassen Sie* ***das***", *bat er weich* [5, с. 24]. – ***Кохту*** *трэба новую* [6, с. 259]. // "***Die Bluse*** *muß neu sein*!" [7, с. 340].

Як бачна з прыкладаў, пры перакладзе немагчыма адлюстраваць фанетычныя асаблівасці дыялектызмаў, таму яны перадаюцца літаратурнымі словамі нямецкай мовы, якія ў большасці выпадкаў з'яўляюцца іх сэнсавымі эквівален-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тамі. Зразумела, што ў гэтым выпадку нельга гаварыць аб поўнай эквівалентнасці, бо пры тоеснасці дэнататыўных значэнняў супастаўляльных лексічных адзінак канатацыі не супадаюць.

У раманах сустракаюцца таксама дыялектныя словы, якія не адлюстроўваюць гукавых асаблівасцей фанетычнай сістэмы гаворкі, а перадаюць асаблівасці гучання асобных слоў. У раманах такія лексемы сустракаюцца рэдка, часцей за ўсё яны ўжываюцца для стварэння камічнага эфекту. У асноўным фанетычна скажаюцца іншамоўныя словы, значэння якіх персанаж не ведае: – *Навука завуць яго. Агратэхніка. – Ха-ха!* ***Абрацехніка!*** [6, с. 273]. // *"Er heißt Wissenschaft. Agrotechnik!" "Hahaha!* ***Abratechnik"*** [7, с. 358]. Фанетычны дыялектызм перадаецца на нямецкую мову аказіяналізмам, створаным па мадэлі літаратурнага нямецкага слова *Agrotechnik*.

2. Уласналексічныя дыялектызмы ўласцівы як маўленню персанажаў, так і аўтарскаму. Яны сустракаюцца ў раманах даволі часта і складаюць 30% ад агульнай колькасці. На нямецкую мову дыялектызмы названага тыпу перакладаюцца наступным чынам:

1) літаратурным словам (нейтральным ці стылістычна маркіраваным). У гэтым выпадку паміж дыялектызмам і яго адпаведнікам выяўляюцца адносіны няпоўнай эквівалентнасці, г. зн. яны маюць тоесныя дэнататыўныя значэнні, але адрозніваюцца канатацыямі, напрыклад: *Далей на агародзе – сярод гарбузніку, градак з агурочнікам, пахучым кропам і* ***кіяхамі*** *– няпэўныя ў змроку абрысы груш, як вартавыя ў балахонах* [6, с. 32]. // *Zwischen den Beeten mit Kürbissen, Gurken, stark duftendem Dill und* ***Mais*** *sah man die vagen Umrisse der Birnbäume, die sich wie Wachposten mit Kapuzen ausnahmen* [7, с. 39]. Параўн.: бел. *кіяхі* (*абл.* 'кукуруза') – ням. *der Mais* ('кукуруза'). Беларускі дыялектызм перакладаецца на нямецкую мову стылістычна нейтральным словам. Перадаецца семантычнае значэнне беларускай рэгіянальнай лексемы, аднак адценне гутарковасці, уласцівае пераважнай большасці дыялектызмаў, у перакладзе не адлюстроўваецца.

Пакуль дзядзькі гаварылі з Міканорам, а жанкі ***растарэквалі*** *каля прыпека, матка з Вольгай і Насцяй, а потым і з бацькам узяліся клапаціцца каля стала* [6, с. 183]. // *Während sich die Männer mit Mikanor unterhielten und die Frauen auf der Ofenbank* ***schwatzen****, kümmerten sich die Mutter, Wolha und Naszja, später auch der Vater um die Bewirtung* [7, с. 238]. Параўн.: бел. *растарэкваць* (*абл.* 'разважаць, балбатаць') – ням. *schwatzen* (*разм.* 'балбатаць'). Беларускі дыялектызм *растарэкваць* перадаецца на нямецкую мову пры дапамозе размоўнай лексемы *schwatzen*. Такі пераклад можна лічыць стылістычна апраўданым, бо дыялектныя словы ў большасці выпадкаў надаюць тэксту адценне гутарковасці, прастамоўя, таму іх перадача на нямецкую мову пры дапамозе размоўных лексем дазваляе дасягнуць функцыянальнай раўназначнасці лексічных адзінак у тэкстах арыгінала і перакладу;

2) фразеалагізмам: – *Відаць, што высах! Адны* ***шчэлепы!*** [6, с. 227] // *"Man sieht ja, wie du schmachtest! Bestehst nur noch aus* ***Haut und Knochen****!"* [7, с. 297]. Параўн.: бел. *шчэлепы* (*абл.* 'сківіцы') – ням. *nur Haut und Knochen* ('адно косць ды скура'). Пераклад беларускага дыялектызма *шчэлепы* нямецкім фразеалагізмам *nur Haut und Knochen* можна лічыць правільным, бо абедзве моўныя адзінкі маюць эмацыянальна-экспрэсіўнае адценне адмоўнай ацэнкі. У іх сэнсавай структуры прысутнічае канатацыйны элемент, які "экспрэсіўна-эмацыянальна афарбоўвае прадметна-лагічнае значэнне" [9, с. 198];

3) рэгіянальнай лексемай нямецкай мовы: *Глушак тхарынымі вострымі вочкамі акінуў амаль пустыя* ***застаронкі****, адзначыў на ўсякі выпадак: канчае малаціць* [6, с. 302]. // *Hluschak musterte mit seinen scharfen Iltisaugen die fast leere*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Scheuer *und stellte fest, daß Saitschyk fast alles ausgedroschen hatte* [7, с. 398]. Параўн.: бел. *застаронак* (*абл.* 'засек у гумне, свіране; месца ў гумне для неабмалочанай збажыны') – ням. *die Scheuer* (*паўд.-ням.* 'хлеў, свіран, збожжасховішча'). Выпадкі перакладу беларускіх дыялектызмаў рэгіянальнай лексемай нямецкай мовы адзінкавыя, бо сістэмы дыялектаў беларускай і нямецкай мовы, як правіла, несумяшчальныя;

4) не перакладаюцца: *Нізкі сушаных грыбоў, уюны, густа начапляныя на дубцы,* ***лутавая*** *каробачка з сухімі чарніцамі, гаршчок з маслам – усё клалі ў сена, загортвалі, рыхтавалі к дарозе* [6, с. 260]. *// Mehrere Gebinde mit getrockneten Pilzen, auf Weidengerten gezogene gedörrte Peitzker, einen <...> Korb mit getrockneten Blaubeeren, ein Töpfchen Butter – all das wurde aufs Heu gelegt und sorgsam zugedeckt* [7, с. 341]. Дыялектызм *лутавы* 'лыкавы' у перакладзе апускаецца як неістотны ў сэнсавых адносінах.

3. Словаўтваральныя дыялектызмы складаюць 4,7% ад агульнай колькасці і ўжываюцца як у маўленні персанажаў, так і ў аўтарскім. Найбольш распаўсюджанай сярод дыялектных адзінак гэтага тыпу з'яўляецца лексема *дамоўка,* якая неаднаразова сустракаецца ў раманах: *Ды і, па праўдзе кажучы, вельмі ж не да душы чорная і цёмная цяперашняя* ***дамоўка****, каб старацца, пяцца для яе, каб яшчэ век векаваць у ёй* [6, с. 162]. *// Der Gedanke,* ***die*** *rußgeschwärzte* ***Bude*** *mühselig umzubauen und ein Leben lang darin zu hausen, behagte ihm wenig* [7, с. 209]. У прыведзеным прыкладзе дыялектызм *дамоўка* ('кватэра, жыллё') ужываецца ў нейтральным кантэксце і перадаецца на нямецкую мову пры дапамозе размоўнага слова *die Bude* ('халупа, хаціна'), якое адпавядае семантыцы беларускага дыялектызма. Аднак лексема *дамоўка* ўжываецца ў раманах не толькі ў нейтральным, але і ў экспрэсіўна-эмацыянальным кантэксце, калі змест сказа паказвае, што дом для персанажа – гэта не толькі памяшканне для жылля, а радзіма, месца, з якім звязаны хвалюючыя ўспаміны: *– У балото... пацягнуло. – Ведамо –* ***дамоўка****!..* [6, с. 105]. *// "Es zieht ihn in die Sümpfe." "Na ja ... ist ja sein* ***Zuhause****"* [7, с. 134]. Ужыты са значэннем 'месца нараджэння' дыялектызм *дамоўка* перакладаецца на нямецкую мову блізкай па семантыцы лексемай *das Zuhause* ('свой куток, свой дом, дамашні ачаг, котлішча').

4. Этнаграфічныя дыялектызмы выкарыстоўваюцца толькі ў аўтарскім маўленні. іх няшмат (2,1%), бо яны ўжываюцца толькі на абмежаванай тэрыторыі і могуць быць незразумелыя для шматлікіх чытачоў. Этнаграфічныя дыялектызмы з'яўляюцца безэквівалентнымі адносна нямецкай мовы і перакладаюцца ў асноўным лексемай, якая мае блізкае значэнне: *У полі грудзі аж захлыналіся ад чысціні, ад холаду не тое што цераз світу, але і цераз добрую* ***чуйку*** *мароз неўзабаве сцінаў усё цела* [6, с. 171]. *// Auf freiem Feld verschlug es einem den Atem, die reine, klare Frostluft drang nicht nur durch den Bauernkittel, sondern auch noch durch den dicken* ***Halbpelz*** *und ließ den ganzen Körper erstarren* [7, с. 221]. Параўн.: бел. *чуйка* (*абл.* 'армяк; доўгая верхняя мужчынская і жаночая вопратка без падкладкі') — ням. *der Halbpelz* ('паўкажушок'). Назва верхняга адзення перакладаецца на нямецкую мову няпоўным эквівалентам, які яшчэ называюць "аналагам" [10, с. 101]. Згодна з Л.С. Бархударавым, такія эквіваленты "толькі прыблізна перадаюць змест адпаведных слоў, але з прычыны адсутнасці дакладных эквівалентаў іх выкарыстанне цалкам апраўдана, таму што яны даюць пэўнае ўяўленне аб характары абазначанага прадмета ці з'явы" [10, с. 101].

5. Семантычныя дыялектызмы складаюць 0,4% ад агульнай колькасці. Сярод дыялектных адзінак гэтага тыпу ў раманах часцей за ўсё сустракаецца лексема *чалавек* ('муж'): *З мужчын быў адзін Годлін* ***чалавек*** *– Эля* [4, с. 46]. *// Von den Männern war nur Godljas* ***Mann*** *Elja da* [5, с. 42]. На нямецкую мову гэты дыя-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лектызм перакладаецца полісемантам *der Mann* ('мужчына, муж, чалавек'), другое значэнне якога цалкам адпавядае семантыцы беларускага дыялектызма.

Такім чынам, прааналізаваны фактычны матэрыял дае падставы вылучыць наступныя віды эквівалентаў стылістычна маркіраваных лексічных адзінак.

1. Эквівакабульныя (слову арыгінала адпавядае слова ў перакладзе):

1) эквіразрадныя (суадносныя лексічныя адзінкі адносяцца да аднолькавых часцін мовы): *Калі* ***ўсунуўся*** *Ларывон і стаў, як дуб, узвышаючыся над усімі, Глушак узрадавана памкнуўся аклікнуць яго* [6, с. 310]. // *Als* ***sich*** *Larywon in die Stube* ***schob*** *und wie eine Eiche in der Mitte aufpflanzte, war Hluschak heilfroh und wollte ihn heranwinken* [7, с. 409]. Параўн.: бел. *усунуцца* (*разм.* 'увайсці павольна, ледзь перастаўляючы ногі') – ням. *sich schieben* ('павольна прабірацца, праціскваца'). Як бачна з прыкладу, дзеяслову ў арыгінале адпавядае дзеяслоў у перакладзе;

2) неэквіразрадныя (суадносныя лексічныя адзінкі адносяцца да розных часцін мовы): – *Тут са сваім* ***няўпраўка***... [6, с. 195]. // "*Ich* ***komme*** *schon mit meinem eigenen Kram nicht* ***zurecht****, und nun noch das*" [7, с. 254]. Параўн.: бел. *няўпраўка* (*разм.* 'немагчымасць выканаць, зрабіць усё, што патрэбна') – ням. *zurechtkommen* ('паспець, спраўляцца'). Назоўніку ў арыгінале адпавядае дзеяслоў у перакладзе.

2. Неэквівакабульныя (слову арыгінала адпавядае ў перакладзе словазлучэнне):

1) свабоднае: *Паставіў некалькі вешак, пралажыў канаўкі, згадаўшы, што такія канаўкі рабіў* ***летась****, калі паказваў, як капаць акопы* [6, с. 198]. // *Er steilte einige Markierstöcke auf, grub Abzugsrinnen, dabei fiel ihm ein, daß er* ***im vergangenen Jahr*** *ähnliche Arbeiten gemacht hatte, als er Neulingen erklären mußte, wie man Schützengräben aushebt* [7, с. 257]. Параўн.: бел. *летась* (*разм.* 'у мінулым годзе') – ням. *im vergangenen Jahr* ('у мінулым годзе');

2) устойлівае: – *А не хочаш, дак* ***каціся*** *адсюль*! [6, с. 203]. // "*Wenn du keine Lust hast, dann* ***zieh Leine***!" [7, с. 264]. Параўн.: бел. *каціся* (*разм.* 'ідзі адсюль') – ням. *Leine ziehen* ('скруціць вуды, зліняць, уцячы').

Сярод прыёмаў, пры дапамозе якіх дасягаецца лексіка-стылістычная эквівалентнасць, выяўлены наступныя.

1. Стылістычны перанос, сутнасць якога ў тым, што лексічная адзінка перакладу захоўвае стылістычныя асаблівасці арыгінальнай лексемы: – *Не помні, Пракопко, што мы тут* ***плялі***... [4, с. 26]. // "*Denk nicht dran, Prakop, was wir hier* ***gefaselt haben***..." [5, с. 26]. Параўн.: бел. *плесці* (*разм.* 'гаварыць што-н. недарэчнае') – ням. *faseln* (*разм.* 'вярзці лухту').

2. Замена маркіраванай адзінкі арыгінала нейтральнай адзінкай у перакладзе: – *Яўхімко! Я... Я –* ***грубая***! [6, с. 224]. // "*Jauchimka! Ich ... Ich bin* ***schwanger***!" [7, с. 293]. Параўн.: бел. *грубая* (*абл.* 'цяжарная') – ням. *schwanger* ('цяжарная').

3. Кампенсацыя. Гэты прыём ужываецца ў тых выпадках, калі пэўныя элементы тэксту зыходнай мовы па той ці іншай прычыне не маюць эквівалентаў у мове перакладу і не могуць быць перададзены яе сродкамі: – *А Гузу –* ***паранку*** [6, с. 104]. // *Und für Hus* ***dämpfe Rüben*** [7, с. 133]. Адсутнасць у мове перакладу эквівалента лексемы *паранка* 'запраўленая паранай бульбай ці мукой і завараная кіпнем сечка або мякіна на корм жывёле' кампенсуецца словазлучэннем *Rüben dämpfen* (*дасл.* 'парыць буракі').

4. Дабаўленне. Сутнасць гэтага прыёму ва ўзнаўленні элементаў, прапушчаных у зыходнай мове, але абавязковых у мове перакладу. Тое, што ў мове арыгінала толькі падразумяваецца, у перакладзе выражаецца эксплiцытна: *Захарыха*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўздыхнула: – Цяжко, ой цяжко! Хоць ***у пельку***... [6, с. 359]. // *Sie seufzte: "Schwer hat man"s, sehr schwer! Manchmal möchte ich* ***mich kopfüber in ein Eisloch stürzen***" [7, с. 471]. Параўн.: бел. *пелька* (*абл.* 'палонка') – ням. *sich in ein Eisloch stürzen* ('кінуцца ў палонку').

5. Элімінацыя. Гэты прыём мае дачыненне да слоў, неістотных у сэнсавых адносінах, пропуск якіх прыводзіць да кампрэсіі тэксту: *Барадаты Пракоп у сваёй купцы, дзе сядзеў і гаспадар хаты, Хадосьчын бацька, і Глушак, важка, басавіта бухаў пра тое, што хтосьці абадраў стог сена* ***ў гале*** [6, с. 136]. // *In der Gruppe, der der Hausherr, Chadoskas Vater, und Hluschak angehörten, donnerte der bärtige Prakop mit tiefer Baßstimme, ihm habe jemand Heu von seinem Schober* <...> *gestohlen* [7, с. 175].

Такім чынам, даследаванне стылістычна маркіраванай лексікі арыгінала і перакладу дазваляе выявіць пэўныя заканамернасці і зрабіць наступныя вывады.

Беларускамоўным размоўным лексемам адпавядае ў перакладзе: 1) размоўнае слова; 2) фразеалагізм, які адносіцца да размоўнага стылю; 3) стылістычна нейтральнае слова; 4) няўстойлівае стылістычна нейтральнае словаспалучэнне; 5) стылістычна нейтральны фразеалагізм. У некалькіх выпадках беларускія размоўныя словы ў перакладзе апускаюцца.

У раманах І. Мележа ўжываюцца розныя тыпы дыялектызмаў, якія перадаюцца на нямецкую мову: 1) літаратурным словам (нейтральным ці стылістычна маркіраваным), якое з'яўляецца іх сэнсавым эквівалентам; 2) фразеалагізмам; 3) рэгіянальнай лексемай нямецкай мовы; 4) няпоўным эквівалентам; 5) полісемантам; 6) аказіяналізмам; 7) не перакладаюцца.

Аналіз беларуска-нямецкіх паралеляў дае падставы вылучыць два асноўныя віды эквівалентаў: эквівакабульныя (эквіразрадныя, неэквіразрадныя) і неэквівакабульныя. Для дасягнення эквівалентнасці стылістычна маркіраваных лексічных адзінак арыгінала і перакладу выкарыстоўваюцца такія прыёмы, як: 1) стылістычны перанос; 2) замена маркіраванай адзінкі стылістычна нейтральнай; 3) кампенсацыя; 4) дабаўленне; 5) элімінацыя.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Драздова, З.У.*** Майстэрства слова: Моўна-стылявыя асаблівасці "Палескай хронікі" Івана Мележа / З.У. Драздова. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 136 с.
2. ***Абабурка, М.В.*** Элементы вусна-гутарковай мовы ў рамане І. Мележа "Людзі на балоце" / М.В. Абабурка // Лінгвістычны аналіз тэксту: матэрыялы семінара / Мінскі педагагічны інстытут імя А.М. Горкага; рэдкал.: Ф.М. Янкоўскі [і інш.]. – Мінск, 1975. – С. 76-82.
3. ***Казлова, Р.М.*** Дыялектная лексіка ў палескіх раманах І. Мележа / Р.М. Казлова // Беларуская мова і мовазнаўства. – 1973. – Вып. 1. – С. 41-56.
4. ***Мележ, І.*** Збор твораў: у 10 т. / І. Мележ. – Мінск: Маст. літ., 1983. – Т. 7: Завеі, снежань: Раман з "Палескай хронікі". – 558 с.
5. ***Melesh, I.*** Dezember, Stürme / I. Melesh // Sowjetliteratur. – 1981. – № 2. – С.10-99.
6. ***Мележ, І.*** Збор твораў: у 10 т. / І. Мележ. – Мінск: Маст. літ., 1983. – Т. 5: Людзі на балоце: Раман з "Палескай хронікі". – 415 с.
7. ***Melesh, I.*** Menschen im Sumpf / I. Melesh. – Berlin: Verlag Volk und Welt, 1974. – 519 с.
8. ***Кавалёва, М.Ц.*** Мележ Іван Паўлавіч / М.Ц. Кавалёва // Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 341-343.
9. ***Лепешаў, І.Я.*** Фразеалогія сучаснай беларускай мовы: вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 271 с.
10. ***Бархударов, Л.С.*** Язык и перевод / Л.С. Бархударов. – М.: Международные отношения, 1975. – 240 с.

Паступіў у рэдакцыю 05.11.2007 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова